наша
свабода

№83(170) ВЫДАЕЦЦА З 25 ЛЮТАГА 2000 ГОДА

8 ЖНІЎНЯ 2001 года СЕРАДА

Адрас: 220123, г.Мінск, а/я 103

тэл. 228-69-18, 210-02-53

E-mail: NPSvaboda@irex.minsk.by http://www.svaboda.com

КОШТ СВАБОДНЫ

«Беларускі варыянт — Ганчарык»

Адзіны кандыдат у прэзідэнты ад шырокай грамадскай кааліцыі старшыня ФПБ Уладзімір Ганчарык заявіў: «У Беларусі не будзе Каштуніцы – будзе Ганчарык».

«У нас дастаткова сілаў, магчымасцяў нармальна рашыць праблему шляхам выбараў. І я думаю, гэта мусіць добра разумець і Аляксандр Лукашэнка. Ніякай трагедыі для яго асабіста, калі ён чысты ў адным пытанні (маецца на ўвазе знікненне палітычных апанентаў рэжыму. – **Р.Б.**), няма, і крычаць, што я ўладу не здам ніколі – гэта проста амаральна. Ён па нараджэнні не быў прэзідэнтам ні зверху, ні з якіх бакоў», — заявіў Уладзімір Ганчарык на сустрэчы з журналістамі ў рамках прэс-клуба Беларускай асацыяцыі журналістаў 7 жніўня.

Гэтым днём У.Ганчарык вярнуўся з Масквы, дзе напярэдадні ён правёў шэраг сустрэчаў з расійскімі палітыкамі: «У адміністрацыі Пуціна я не меў ніякіх сустрэчаў, але перамаўляў з вельмі сур'ёзнымі людзьмі». У.Ганчарык, не называючы прозвішчы сваіх суразмоўцаў, ацэньвае вынікі кансультацыяў як «вельмі станоўчыя». Прэтэндэнт заявіў таксама пра «вельмі станоўчыя зрухі па сітуацыі на Беларусі» з боку Крамля.

Адказваючы на пытанне пра будучыню А.Лукашэнкі ў выпадку перамогі дэмакратычнага кандыдата, Уладзімір Ганчарык заявіў: «Усе пралікі ў эканоміцы не патрэбна караць – людзі зрабілі свой выбар, ён працаваў як умеў. А вось іншае, калі штосьці звязана са знікненнем людзей, то за ўсё трэба адказваць».

Заканчэнне на стар.3


Фота Ул.ШЛАПАКА

«Селектар» без сенсацыяў

Прайшоўшая ўчора селектарная нарада па «актуальных пытаннях уборачнай кампаніі» не здолела нарадзіць новых сенсацыяў. Усе яе ўдзельнікі – міністры, кіраўнікі аблвыканкамаў, старшыня Нацыянальнага банка – рапартавалі пра значныя поспехі ў справе ўборкі ўраджаю.

Рапарты відавочна спадабаліся кіраўніку дзяржавы. Бачна было, як ён разлагоднеў і нават пачаў жартаваць.

Па словах А.Лукашэнкі, сёлета ў Беларусі чакаецца вельмі добры ўраджай збожжа, і калі ўсё атрымаецца, то ўпершыню за гады кіраўніцтва ім краінай Беларусь здолее забяспечыць уласныя патрэбы ў збожжы. Але пры гэтым будзе набыта некалькі тысяч тон цвёрдых гатункаў пшаніцы, якую немагчыма вырошчваць у Беларусі з-за нацыянальных асаблівасцяў клімату.

А.Лукашэнка на вачах беларускіх тэлегледачоў паклаў гэты поспех сабе «ў кішэню». Сапраўды, калі Беларусь не будзе сёлета набываць збожжа за мяжой, гэта будзе вялікі эканамічны плюс. Але, як адзначыў сам кіраўнік краіны, такі поспех быў дасягнуты ўпершыню за ўсе часы ягонага кіраўніцтва Беларуссю. І трэба ж надарыцца такому супадзенню, што ўрачыста паведаміць пра цудоўны ўраджай у А.Лукашэнкі атрымаецца першымі днямі верасня – якраз напярэдадні выбараў.

Натуральна, што наша найлібералейшая Цэнтральная камісія па правядзенні выбараў нават не палічыць гэты факт за перадвыбарную агітацыю. Сапраўды, якая тут можа быць агітацыя? «Адмовіўшыся ад імпарту збожжа, мы эканомім прыкладна 200 млн. долараў у год.

Заканчэнне на стар.3

Прэзідэнцтва ім толькі сніцца

Спробы патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты былога пасла Беларусі ў Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі Міхаіла Марыніча і Леаніда Сініцына даказаць, што яны сабралі звыш 100 тысячаў подпісаў і захоўваюць правa на працяг прэзідэнцкай барацьбы, аказаліся бясплённымі. 3 жніўня М.Марыніч перадаў у Цэнтрвыбаркам заяву з просьбай прызнаць 4.500 подпісаў, «знойдзеных» у двух тэрытарыяльных камісіях Мінска. У выпадку прызнання гэтых чатырох з паловай тысячаў подпісаў, далучаных да 96 тысячаў, здадзеных своечасова, былы пасол атрымліваў бы рэальны шанц працягнуць барацьбу за прэзідэнцкае крэсла. Аднак 6 жніўня рабочая група Цэнтрвыбаркама, пракуратуры і патэнцыйнага кандыдата фактычна разбурыла ўсе надзеі Міхаіла Марыніча на далейшую барацьбу.

«У Фрунзенскім і Маскоўскім раёнах (менавіта там, паводле М.Марыніча, выяўленая недастача. – **Р.Б.**) усе подпісы прынятыя, і ніякіх дадатковых подпісаў, падпісных лістоў не выяўлена. Выяўлена памылка членаў тэрытарыяльных камісіяў – у адным і другім выпадках – пры выдачы распіскі пра колькасць прынятых падпісных лістоў і подпісаў. У Маскоўскім раёне двум сябрам ініцыятыўнае групы Міхаіла Марыніча дадзеная адна распіска на двух, якая адлюстроўвае сумарную колькасць здадзеных подпісаў: і ў журнале ёсць два радкі, якія пацвярджаюць, што здадзена 1.400 подпісаў, а другі – 50. А ў Фрунзенскім раёне нібыта на адну партыю падпісных лістоў двойчы давалася распіска. Аказаліся дзве распіскі прыкладна на 3 тысячы подпісаў кожная – гэта чыста механічная памылка. Але ў журнале рэгістрацыі ўваходных дакументаў і ў адным, і ў другім выпадках усё дакладна зафіксавана: ёсць подпісы грамадзянаў, якія здавалі падпісныя лісты, ёсць подпісы членаў камісіяў, ёсць колькасць падпісных лістоў і подпісаў, — заявіў 6 жніўня сакратар Цэнтральнай камісіі Мікалай Лазавік. – Гэтыя 4.500 подпісаў існуюць, і яны ўжо ўлічаныя. Пытанне стаяла пра паўторны іх улік. Мы ў суботу з Міхаілам Апанасавічам тут сустракаліся, пагутарылі, але, як кажуць, «на нет і суда нет» – няма гэтых подпісаў. Таму пры ўсім жаданні дапамагчы яму мы гэтых подпісаў нідзе не знойдзем», — заявіў М.Лазавік.

Заканчэнне на стар.3

Пікет каля тэлецэнтра

9 жніўня а 17-й гадзіне Аб'яднаная грамадзянская партыя арганізуе пікет ля будынка тэлецэнтра ў Мінску (вул. Макаёнка, 9), паведаміла БелаПАН прэс-служба АГП. Пікет будзе прадстаўлены ў выглядзе ланцуга людзей з партрэтамі ахвяр палітычных рэпрэсій.

Каменціруючы дадзеную ініцыятыву, старшыня партыі Анатоль Лябедзька зазначыў: «Для мяне прозвішчы Зімоўскі, Азаронак, Новікаў – сінонімы слова «хлусня». Сённяшняе БТ — гэта рассаднік паклёпу і калектыўны саўдзельнік злачынства — выкрадання вядомых у Беларусі людзей. Спрабуючы замоўчваць або сказаць тое, што здарылася з Віктарам Ганчаром, Юрыем Захаранкам, Генадзем Карпенкам і іншымі ахвярамі дыктатуры, дзяржаўныя СМІ становяцца ў адзін шэраг з арганізатарамі і выканаўцамі злачынстваў».

Прызнанне выбараў пад пытаннем

Беларускія ўлады ўсяляк зацягваюць і перашкаджаюць эфектыўнаму міжнароднаму назіранню за прэзідэнцкімі выбарамі. З такой заявай 6 жніўня выступіў кіраўнік Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ Жэрар Штудман – асноўнага еўрапейскага інстытута па назіранні за выбарамі.

«Такая сітуацыя непрымальная. Ніколі раней ні адна з краінаў-удзельніцаў АБСЕ не адмаўляла прадстаўнікам БДІПЧ у запрашэнні для правядзення назірання за выбарамі. Гэта відавочнае парушэнне міжнародных абавязацельстваў беларускім урадам», — заявіў дырэктар Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Жэрар Штудман. Яшчэ на пачатку ліпеня БДІПЧ выказала гатоўнасць накіраваць місію са 150 доўгатэрміновых назіральнікаў, якія мусілі былі прыехаць адсочваць сітуацыю за шэсць тыдняў да выбараў, і 14 караткатэрміновых назіральнікаў. Аднак беларускія ўлады адмовіліся выдаць уязныя візы пяці назіральнікам, якія меліся прыехаць 1 жніўня на адкрыццё планаванага офіса БДІПЧ. У той час, як беларускія ўлады запрасілі назіральнікаў з асобных краінаў і міжнародных арганізацыяў, яны відавочна пагрэбавалі запрасіць БДІПЧ. «Рабіце ўласныя высновы, чаму яны вырашылі заблакаваць прыезд адзінай еўрапейскай многабаковай арганізацыі, якая ў стане правесці буйнамаштабнае доўгатэрміновае назіранне. Засталося мала часу. У выніку гэтых перашкодаў ужо надзвычай позна правесці такое паўнацэннае назіранне, якое мы праводзім у іншых краінах. Ставіцца пад сумнеў давер да ўсяго выбарчага працэсу», — заявіў дырэктар БДІПЧ Жэрар Штудман.

У звязку з заявай БДІПЧ АБСЕ прэс-сакратар міністэрства замежных сувязяў Беларусі Павел Латушка заявіў: «Наш каментар будзе адзіны і вельмі просты: Беларусь накіруе ў бліжэйшы час запрашэнне Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ запрашэнне прыняць удзел у маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбарах». Тым жа часам Павел Латушка адмовіўся акрэсліць часавыя рамкі, у межах якіх запрашэнне будзе накіраванае БДІПЧ АБСЕ. «Праз месяц, зразумела, запрашэнні накіроўваць мы не можам – гэта, зразумела, страціць усялякі сэнс. Гаворка ідзе аб самым бліжэйшым часе – болей я не магу нічога сказаць», — сказаў прэс-сакратар беларускага МЗС.

Рыгор БУЯН

Мяняйма чужое на сваё

Ужо тры тыдні запар у выхадныя ў Мінску ў парку Янкі Купалы праходзяць акцыі, падчас якіх кожны ахвотны мае магчымасць памяняць кніжкі савецкага часу і зместу на літаратуру беларускую. Тое самае тычыцца аўдыёкасетаў. Як паведамляе Радыё «Рацыя», за чатыры касеты з запісамі расійскай папсы вам тут дадуць адну беларускую, а за 15 – бел-чырвона-белы сцяг.

Бібліятэка для Жодзінскага СІЗА

Беларуская асацыяцыя журналістаў збірае бібліятэку для передачы ў Жодзінскі СІЗА Калі вы хочаце далучыцца да акцыі БАЖ, тэлефануйце 226.70.98 або прывозьце вашы ахвяраванні на адрас пл. Свабоды, 17-304. Акцыя працягнецца да 31 жніўня.

Польскія гандлёвыя прадстаўніцтвы

Як паведаміў гандлёвы дарадца польскай амбасады ў Беларусі Станіслаў Пагарыла, у планах міністэрства эканомікі Польшчы адкрыццё гандлёвых прадстаўніцтваў у Гродне і Брэсце. Для палякаў гэта стала магчымым пасля ўвядзення ў нашай краіне адзінага курсу валют.

Курс па надзвычайных сітуацыях

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі звярнулася да міністэрства адукацыі з прапановай пачаць у школах выкладанне курса «Папярэджанне і ліквідацыя надзвычайных сітуацыяў». Адпаведныя эксперыменты ўжо былі праведзеныя ў некаторых школах у Барысаве і Гомелі.

«7 дней» Чыкіна

Пакінуўшаму пасаду старшыні Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Віктару Чыкіну знойдзена новае месца працы. І зноў у СМІ. Гэтым разам яго прызначылі на рэдактара газеты «7 дней».


Чацвёртыя па гарадках

Зборная Беларусі па гарадках заняла чацвёртае месца на чэмпіянаце свету, які завяршыўся ў Санкт-Пецярбургу напачатку жніўня. У матчы за трэцяе месца беларусы прайгралі ўкраінцам.

Віцебскі «нуль»

Знак «нулявога кіламетра» (пункт адліку аўтадарог) з'явіўся ў Віцебску. Ён узведзены на плошчы Перамогі гэтага горада. Аддегласць да Мінска ад гэтага знака – 263 кіламетры.

НАДВОР'Е



Крыніца: www.gismeteo.ru

Курс наяўнага долара на «чорным рынку»

1450



ВОЙСКА

Вялікія манеўры

6 жніўня Аляксандр Лукашэнка правеў нараду, падчас якой абмяркоўваліся пытанні, датычныя правядзення 26 жніўня — 3 верасня комплексных аператыўна-тактычных вучэнняў Узброеных Сілаў рэспублікі «Нёман-2001». Плануецца, што ў вучэннях, якія пройдуць на некалькіх палігонах, возьмуць удзел больш за 10 тысяч ваеннаслужачых, у тым ліку ўнутраных войскаў МУС і падраздзяленняў міністэрства па надзвычайных сітуацыях. На манеўрах будуць задзейнічаныя больш за 60 танкаў, 60 адзінак ракетных і артылерыйскіх сістэмаў, каля 200 бронетранспарцёраў, 40 самалётаў і верталётаў, больш за тысячу адзінак аўтамабільнай ваеннай тэхнікі.

Па словах А.Лукашэнкі, падчас вучэнняў будуць адпрацаваныя пытанні прымянення наяўных сілаў і сродкаў для гарантавання ваеннай бяспекі Беларусі. Пры гэтым ён заначыў, што манеўры будуць насіць цалкам абарончы характар, паколькі, згодна з ваеннай дактрынай, рэспубліка не разглядае ніводную з дзяржаваў у якасці ваеннага праціўніка. Разам з тым, па словах прэзідэнта, «мы павінны прадэманстраваць сябрам, партнёрам, у прыватнасці Расійскай Федэрацыі, і непрыяцелям, што ў Беларусі Узброеныя Сілы знаходзяцца на належным баявым узроўні і здольныя адстаяць суверэнітэт і незалежнасць дзяржавы».

Вячаслаў БУДКЕВІЧ

Прывядзі бацькоў на выбары!

5 жніўня бабруйскія гарадскія арганізацыі Малады Фронт ды Маладыя Сацыял-Дэмакраты правялі чарговую мабілізацыйную акцыю. На гэты раз маладзёны раздавалі цукеркі Чупа-Чупс, да якіх былі прышпіленыя папяровыя стужкі з надпісам: «9 верасня – выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прывядзі бацькоў на выбарчы ўчастак». Амаль па ўсім цэнтры горада (плошча Перамогі, плошча Леніна, дзіцячы парк, вуліца Савецкая ды Сацыялістычная і інш.) працавалі летнія Санта Клаўсы: усім дзецям, што праходзілі побач, яны раздавалі салодкія падарункі з нататкай для бацькоў. Акцыя прайшла паспяхова і мае вялізны рэзананс па горадзе.

Алена АНДРЭЕВА

АДУКАЦЫЯ

Сумяшчальны іспыт

Па выніках школьнай выпускной кампаніі гэтага года 34 тысячы старшакласнікаў пажадалі прайсці тэставую ацэнку сваіх ведаў, якая потым па іх жаданні залічвалася на школьных выпускных і ўступных іспытах у ВНУ. Па выніках выпускной кампаніі мінулага года такіх ахвотнікаў знайшлося 18 тысяч, а пазамінулага – 6 тысяч.

Гэта толькі першы крок па ўкараненні аднаго "ўступна-выпускнога" іспыту для школьнікаў, якія жадаюць працягнуць сваю вучобу ў ВНУ. Са словаў міністра адукацыі Васіля Стражава, звычайнай і паўсюднай з'явай ён можа стаць толькі праз 6-7 гадоў. Адзнакі такога іспыту рэгіянальныя і тэхнічныя ВНУ прызнаюць ужо зараз, а медычныя зробяць гэта з наступнага года.

Зараз тэставанне праводзіцца толькі па беларускай і рускай мовах, па фізіцы і матэматыцы і афіцыйна ўлічваецца толькі па жаданні выпускніка. З гэтага навучальнага года будуць распрацаваны тэсты па біялогіі і хіміі, а адзіны іспыт пачне праводзіцца па жаданні і сярод выпускнікоў сярэдне-спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных установаў.

Алена ЛАБАНАВА

Супраць рэканструкцыі МКАД у Курапатах

7 жніўня ўправа сойму Кансерватыўна-хрысціянскай партыі-БНФ распаўсюдзіла адкрыты ліст Савету міністраў Беларусі, у якім выказаны пратэст у сувязі з плануемай рэканструкцыяй і пашырэннем участка Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарогі, што праходзіць праз урочышча Курапаты.

«Усяму свету вядома, што ў Курапатах камуністычнымі ўладамі ў 1930-х, 1940-х гадах расстраляныя і закапаныя сотні тысяч бязвінных людзей, — гаворыцца ў пасланні. — Савецка-камуністычны рэжым утойваў свае злачынствы, так было і з урочышчам Курапаты. Дарога праз Курапаты — гэта злачынства, здзейсненае савецкімі ўладамі. Сёння пашыраць аўтадарогу праз урочышча Курапаты, будаваць на касцях бязвінных ахвяраў — гэта значыць пашыраць злачынства». Аўтары ліста звяртаюць таксама ўвагу беларускага ўрада на тое, што «недапушчальна абгрунтоўваць мэтазгоднасць пракладкі кальцавой аўтадарогі праз Курапаты эканамічнымі інтарэсамі, а фактычна пераступаць праз жыцці, душы і памяць людзей».

Алег САКАЛОЎ

Паліўны крэдыт пад ураджай

Для забеспячэння ўборкі ўраджаю сельскагаспадарчым арганізацыям Беларусі будзе выдадзена 40 тысяч тонаў дызельнага паліва і 20 тысяч тонаў аўтамабільнага бензіну ў выглядзе таварнага крэдыту. Такое даручэнне Дзяржаўнаму камітэту па матэрыяльных рэзервах утрымліваецца ў пастанове, якая прынятая Саветам міністраў.

Водпуск нафтапрадуктаў будзе праведзены праз абласныя арганізацыі па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні аграпрамысловага комплексу краіны. Калгасы і саўгасы павінны пакрыць кошт атрыманага дызпаліва і бензіну да 31 снежня 2001 года.

Гэты таварны крэдыт заклікалы выправіць складанае становішча з забеспячэннем агракомплексу паліўнымі рэсурсамі падчас уборкі ўраджаю. Па звестках на канец чэрвеня, рэшткі дызельнага паліва ў гаспадарках рэспублікі былі на 22, а бензіну — на 32% менш за мінулагодні ўзровень.

Сяргей СНЕГІН

ЛЮСТРАФАКТ



Фота IREX/ProMedia

Людскія праблемы ўладу не турбуюць

6 жніўня ў Мінску група грамадзянаў правяла стыхійны пікет каля Дома ўрада, дзе размешчаная Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Удзельнікі акцыі, сярод якіх большасць складалі маці загінуўшых у беларускай арміі салдатаў, пратэставалі супраць ігнаравання іх праблемаў дзяржаўнымі чыноўнікамі. Кіраўнік Палаты прадстаўнікоў Вадзім Папоў прыняць грамадзянаў адмовіўся.

Тыя, хто сабраўся каля Дома ўрада, лічаць, што сталі закладнікамі закона аб звароце грамадзянаў. У 1996-м годзе Аляксандр Лукашэнка ініцыяраваў наступную папраўку ў закон: калі дзяржаўная асоба палічыла, што праблема вырашана, усялякае перапіска з заяўнікам спыняецца. Такім чынам, адзначалі ўдзельнікі пікета, чыноўнікі фактычна пазбавіліся ад скаргаў тысяч людзей, якія абіваюць парогі дзяржаўных установаў.

Спачатку тыя, хто прыйшоў да Дома ўрада, сабраліся ў фае таго крыла будынка, дзе размешчаны парламент, але памочнікі кіраўніка Палаты прадстаўнікоў спачатку сказалі, што ён паехаў у Віцебск, потым — быццам у Гродна, а нарэшце было заяўлена, што ён вельмі заняты. Абураныя людзі выйшлі ў сквер на плошчы Незалежнасці і правялі кароткі несанкцыяваны пікет, разгарнуўшы некалькі плакатаў.

Адна з удзельніц пікета, Марыя Алфяровіч, ужо сем гадоў патрабуе дадатковай экспертызы ў справе забітага ў арміі сына. Сёння ёй чарговы раз адмовілі ў прыёме. У размове з журналістамі яна сказала: «Я, маці забітага салдата, звярталася да Лукашэнкі 400 разоў! У 96-м годзе была ў яго на асабістым прыёме. Ён дзеля мяне пальцам не варухнуў! Таму я — за любога іншага, але толькі не за Лукашэнку».

Генадзь БАРБАРЫЧ

ФІНАНСЫ

Банкиры ждут судного дня

8 августа под председательством Александра Лукашенко должно пройти совещание с банкирами Беларуси. Последнее мероприятие такого рода проводилось несколько лет назад. Нынешнее имеет особое значение, так как будет проводиться за месяц до президентских выборов. Банкиры ожидают очередных дополнительных поборов в пользу нынешней власти. По некоторым данным, А.Лукашенко собирается предъявить определенным банкирам материалы, свидетельствующие о финансовой поддержке ими некоторых оппозиционных структур и политиков. Вполне возможно, что прямо на совещании будут сделаны организационные выводы и публичные экзекуции. В это же время польские власти будут рассматривать вопрос о дальнейшей судьбе Леонида Волка – задержанного предпринимателя, гражданина Израиля, обвиняемого белорусскими властями в хищении валютного кредита.

Агентство «Ю.С.Ньюс» (www.yusnews.com)

БПСМ пагражае размаляваць сцены

Як пажаліліся журналістам на прэс-канферэнцыі прадстаўнікі Беларускага патрыятычнага саюза моладзі, зараз распачаўся «досыць сурёзны накат на арганізацыю», які яны звязваюць з надыходзячымі прэзідэнцкімі выбарамі ў краіне. «Мне наўцям інфармацыйныя атакі, якую разгарнулі многія так званыя незалежныя апазіцыйныя сродкі масавай інфармацыі ў адносінах да нашай арганізацыі... Матэрыялы асноўваюцца на нейкіх домыслах, не маючых пад сабой рэальных фактаў, і асноўная мэта ўсіх матэрыялаў – зняславіць БПСМ», — заявіў першы сакратар БПСМ Юрый Салаўёў. Але рэальны факт ёсць. Гэта дачасная агітацыя «за бацьку», за што БПСМ нават атрымаў папярэджанне ад Цэнтрвыбаркама.

Вялікае абурэнне прадстаўнікі БПСМ выказалі наконт размалявання сценаў будынкаў, дзе месцяцца тэрытарыяльныя структуры БПСМ, надпісамі «экстрэмісцкага» зместу, як то «Зубр» ці «Время убирать!». У адказ «патрыёты» пагражаюць размаляваць офісы Маладога Фронту і «Зубра» сваімі надпісамі. Пры гэтым Салаўёў сказаў, што сваім актывістам арганізацыя гэтага забараняць не будзе.

З 3 жніўня «патрыёты» пачалі рыхтаваць сваіх назіральнікаў за ходам прэзідэнцкіх выбараў. З жадання сканоміць уласныя грошы, яны звярнуліся ў КНГ АБСЕ з прапановай прафінансаваць правядзенне навучальных семінараў для 25 тысяч «патрыётаў-наглядальнікаў». Адказ з прапановай прыняць удзел у семінарах, якія праводзяцца для ўсіх маладзёжных арганізацыяў, іх не задаволіў.

Алена ЛАБАНАВА

ЭКАНОМІКА

Падатак на футра

42 індывідуальныя прадпрымальнікі, якія гандлююць на цэнтральным рынку Гомеля галаўнымі ўборамі з натуральнага футра, фактычна пазбаўляюцца свайго заробку.

Як паведаміла БелаПАН 6 жніўня старшыня савета прадпрымальнікаў рынку Надзея Комава, інспекцыя Дзяржаўнага падаткавага камітэта па Гомелі паведаміла, што з 1 жніўня стаўка адзінага падатку для дадзенай катэгорыі прадпрымальнікаў павялічылася з 35 да 110 еўра. Падставай для гэтага паслужыла растлумачэнне міністэрства гандлю аб тым, што галаўныя ўборы адносяцца да разраду адзення з натуральнага футра. «Такі падатак мы не ў стане заплаціць. Галаўныя ўборы мы шыем самі, купляючы футра ў зверагаспадарках», — паведаміла Надзея Комава.

6 жніўня Надзея Комава падала заяву з просьбай адмяніць рашэнне аб павелічэнні стаўкі падатку начальніку інспекцыі ДПК па Гомельскай вобласці Дзмітрыю Ждану. Да заявы старшыня савета прыклала растлумачэнне Гомельскага аддзялення Беларускай гандлёва-прамысловай палаты аб тым, што галаўныя ўборы — цалкам асобны падклас швейных вырабаў, які не ўваходзіць у паняцце «адзенне».

Ірына ШАНЦАВА

ЗАЯВА

Моладзь пратэстуе супраць рэпрэсіяў

17 зарэгістраваных і нефармальных маладзёжных арганізацыяў Беларусі зрабілі сумесную заяву што да рэпрэсіяў супраць палітычна актыўнай моладзі, якія разгарнуліся супраць моладзі апошнім часам з боку ўладаў. Як адзначаецца ў заяве, падпісанай Маладым Фронтам, «Зубрам», Маладой Грамадой, Задзіночаннем беларускіх студэнтаў, Асацыяцыямі маладых палітыкаў і прадпрымальнікаў, моладдзю АГП, ТБМ і прадстаўнікамі іншых аб'яднанняў, рэпрэсіі болей. Чым бліжэй прэзідэнцкія выбары.

Узгадваюцца пагром, учынены мінскай міліцыяй у офісе маладзёжнай кааліцыі – Маладзёжны Хрысціянскі Сацыяльны Саюз, «Моладзь АГП», БАМП, Маладыя Сацыял-дэмакраты, арышт на Дзень Незалежнасці некалькіх дзесяткаў «зубраўцаў», масавыя выклікі і допыты ў КДБ актывістаў Маладога Фронту.

У заяве гаворыцца, што «рэжым Лукашэнкі ўзмацняе рэпрэсіі, бо адчувае сваю слабасць». «Нягледзячы на ціск», моладзь збіраецца «працягваць сваю працу» і перакананая: «Мы пераможам!»

Кірэй МАНУЙЛА

Мясакамбінату прафсаюз непатрэбны?

На Магілёўскім мясакамбінаце зробленая спроба ліквідацыі прафсаюзнай арганізацыі. Па словах старшыні Магілёўскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Анатоля Любчанкі, заводская прафарганізацыя прадпрыемства ліквідуецца па ініцыятыве кіраўніцтва камбіната.

У прафсаюзную арганізацыю прадпрыемства ўваходзіць каля 1.200 чалавек. Дырэктар камбіната Міхаіл Хартоў спасылаецца на масавае напісанне заяваў работнікамі аб выхадзе з прафсаюза. Анатоль Любчанка не выключае магчымасці, што заявы маглі быць напісаныя пасля адпаведнай каманды адміністрацыі.

Цяпер абласное аб'яднанне рыхтуе на мясакамбінаце прафсаюзную канферэнцыю, на якой павінен вырашыцца лёс заводскай арганізацыі. Па словах А.Любчанкі, спробы скасаваць прафарганізацыі былі раней на Бабруйскім машынабудаўнічым і Магілёўскім металургічным заводах. Ён таксама не выключыў, што хутка з'явяцца і іншыя падобныя прыклады.

Канстанцін УВАРАЎ

АРЫШТ

Нават 15-гадовых — у міліцыю

У Зэльве на мінулым тыдні ў міліцыю былі дастаўленыя актывісты «Зубра» Яўген Скіба і Аляксандр Навумчык. Першаму з іх 15 гадоў, другому — 17. Маладзейшага патрымалі болей як 3,5 гадзіны, адпусцілі ў палове 12 ночы.

Хлопцы раздавалі каля дыскатэкі спецвыпуск газеты НАША СВАБОДА. Пры сабе яны мелі 23 паасобнікі. Міліцыянты папярэдзілі юных зуброўцаў, каб тыя «завязвалі».

Сяргей МАКСІМОВІЧ

Старая добрая паказуха

Непаўторнае сьвяточнае аблічча неўзабаве набудуць два райцэнтры Гомельшчыны — Сьветлагорск і Мазыр. У верасьні ў Мазыры пройдуць Лукашэнкавы «Дажынкі», а Сьветлагорск адзначыць сваё 40-годзьдзе.

Калі шчыра, мазыраны нэрвуюцца: каму прыемна трэці месяц запар назіраць узбуйленых асфальт. Шмат каму з гараджанаў не падабаецца, што надарма выдаткоўваюцца дзяржаўныя грошы: новы асфальт мяняюць на плітку. А вось для ўладаў кампанія акультурваньня гораду — справа гонару. Іх нават мала бянтэжыць, што на ўсіх мазырскіх прадпрыемствах месяцамі не выплочваюць заробку. Натуральна, гэтыя грошы ідуць на падрыхтоўку дажынкавых відовішчаў.

Таксама будаўнічы бум назіраецца й у Сьветлагорску. Па словах намесьніка старшыні гарвыканкаму Яўгена Ждановіча, да верасьня Сьветлагорск набудзе сапраўды сьвяточнае аблічча: адрэстаўруюць аўтобусны й чыгуначны вакзалы, забрукуюць пліткаю цэнтральны пляц, пашыраць і абновяць набярэжжы.

Усе гэтыя пэратварэньні фінансуюцца пераважна коштам прадпрыемстваў і прыватнікаў. Прыкладам, толькі ВА «Беларуснафта» вылучыла на гэтыя мэты 110 млн. руб. Амаль 5 млн. на навамі 44 шыльды коштам па $100 з назвамі вуліцаў выдзеліла абласная ўлада. Праўда, прачытаць, што на іх напісана, можна будзе толькі ўздзень, бо ў цёмную пару Сьветлагорск амаль не асьвятляецца. Аднак радуе тое, што назвы вуліцаў упершыню будуць напісаныя па-беларуску.

Анэля ШЧЫПАКОЎСКАЯ, Радыё «Рацыя»

Прэзідэнцтва ім толькі сніцца

Заканчэнне. Пачатак на стар.1

Былы першы кіраўнік прэзідэнцкай адміністрацыі Леанід Сініцын напачатку жніўня перадаў у ЦВК усе дакументы, неабходныя для ягонай рэгістрацыі кандыдатам у прэзідэнты: дэкларацыі аб даходах і маёмасці, аўтабіяграфію ды заяву аб згодзе балатавацца. Л.Сініцын лічыць, што ён мусіць працягнуць прэзідэнцкую барацьбу, бо сабраў і перадаў у ЦВК звыш 100 тысячаў подпісаў. Аднак, паводле ЦВК, Л.Сініцын здаў толькі 86 тысячаў подпісаў. «Па Сініцыну пытанне вырашанае канчаткова, бо мы 25 ліпеня прынялі канчатковае рашэнне па сабраных подпісах. У яго пададзена больш за 86 тысячаў, але, па яго словах, у сапраўднасці ён бачыў, трымаў у руках і раздаў членам ініцыятыўнае групы больш за 100 тысячаў з тым, каб яны передалі іх у тэрытарыяльныя камісіі. У выніку гэтыя людзі аказаліся непрыстойнымі і не данеслі подпісы да выбарчых камісіяў. Той запас, які ў яго застаўся, які ён пакінуў, забракаваў па нейкіх крытэрыях і не здаваў у тэрытарыяльныя камісіі, ён спрабаваў перадаць 25 ліпеня ў Цэнтральную камісію. Але па законе апошні тэрмін здачы падпісных лістоў – 20 ліпеня, працягнуць гэты тэрмін ніхто не мае права; а другое, лісты павінны здавацца ва ўстаноўлены тэрмін у тэрытарыяльныя камісіі, а не ў Цэнтральную камісію», — заявіў Мікалай Лазавік.

Леанід Сініцын мае права абскардзіць рашэнне ЦВК у Вярхоўны суд Беларусі. Але «Вярхоўны суд, мяркую, канстатуе факт, што мы кіраваліся строга законам і ніякага парушэння няма», — падкрэсліў сакратар ЦВК. Між тым, сам Л.Сініцын выказаў гатоўнасць сваё права працягваць прэзідэнцкую барацьбу нават у Канстытуцыйным судзе, а калі і КС не вырашыць праблему станоўча, то Л.Сініцын плануе ініцыяваць агульнанацыянальны рэферэндум.

Рыгор БУЯН

Пачынаюцца выплаты ахвярам

Сёння мусяць пачацца выплаты валютных кампенсацыяў ахвярам фашызму. Былыя вязні нямецкіх канцэнтрацыйных лагераў і гета, іншыя зняволеныя і прыгонныя рабочыя, у тым ліку непаўнагадовыя, якія падчас Другой сусветнай вайны апынуліся на тэрыторыі Германіі, атрымаюць кампенсацыі у памеры ад 5 да 15 тысяч нямецкіх марак. Як паведамілі прадстаўнікі Беларускага фонду «Узаемапаразуменне і прымірэнне», агульны памер выплатаў беларусам складзе 694 мільёны нямецкіх марак (больш за 300 мільёнаў долараў).

У першую чаргу кампенсацыі атрымаюць 10.000 былых вязняў канцлагераў і гета з асабліва жорсткім рэжымам утрымання, а таксама ахвяраў фашызму вельмі сталага ўзросту.

Кампенсацыйныя выплаты будуць ажыццяўляцца на падставе закона, прынятага бундэстагам Германіі 30 траўня. Закон зацвярджае выплату прыгонным рабочым і ахвярам фашызму ва ўсім свеце больш як 10 мільярдаў нямецкіх марак (4 мільярды 600 мільёнаў долараў). Нямецкі парламент ухваліў выплату гэтых грошай з сродкаў дзяржаўна-прамысловага фонду «Памяць, адказнасць і будучыня» пасля таго, як у ЗША былі адхіленыя апошнія індывідуальныя зыскі грамадзянаў да фірмаў Германіі.

Як нагадвае агенцтва БелаПАН, нямецкая кампенсацыя разлічаная на больш чым 150 тысяч былых беларускіх остарбайтэраў, чыя рабская праца выкарыстоўвалася «трэцім рэйхам» у 1939-1945 гадах. Усяго ж падчас Другой сусветнай вайны на тэрыторыю Германіі былі гвалтоўна вывезеныя больш за 400.000 беларускіх грамадзянаў, якія сталі вязнямі прымусовай працы.

На сёння запланаваная таксама ўрачыстая цырымонія з нагоды пачатку выплаты кампенсацыяў, якая мусіць адбыцца ў памяшканні беларускага фонду «Узаемапаразуменне і прымірэнне» з удзелам прадстаўнікоў нямецкага фонду «Памяць, адказнасць і будучыня».

Міхась КАРПОВІЧ

Паліўны крэдыт пад ураджай

Для забеспячэння ўборкі ўраджаю сельскагаспадарчым арганізацыям Беларусі будзе выдадзена 40 тысяч тонаў дызельнага паліва і 20 тысяч тонаў аўтамабільнага бензіну ў выглядзе таварнага крэдыту. Такое даручэнне Дзяржаўнаму камітэту па матэрыяльных рэзервах утрымліваецца ў пастанове, якая прынятая Саветам міністраў.

Водпуск нафтапрадуктаў будзе праведзены праз абласныя арганізацыі па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні аграпрамысловага комплексу краіны. Калгасы і саўгасы павінны пакрыць кошт атрыманага дызпаліва і бензіну да 31 снежня 2001 года.

Гэты таварны крэдыт закліканы выправіць складанае становішча з забеспячэннем агракомплексу паліўнымі рэсурсамі падчас уборкі ўраджаю. Па звестках на канец чэрвеня, рэшткі дызельнага паліва ў гаспадарках рэспублікі былі на 22, а бензіну – на 32% менш за мінулагодні ўзровень.

Сяргей СНЕГІН

«Беларускі варыянт — Ганчарык»

Заканчэнне. Пачатак на стар.1

Літаральна падчас паседжання прэс-клуба кіраўнік перадвыбарнага штаба адзінага кандыдата Васіль Лявонаў перадаў Уладзіміру Ганчарыку запіску наступнага зместу: «Палкоўнік Алкаеў згодны з тым, каб Вы сёння пацвердзілі: рапарт напісаны Алкаевым уласнаручна».

Як вядома, былы начальнік СІЗА №1 палкоўнік Алег Алкаеў прахoдзіў па справе аб зніклення сведкам; ва ўласнаручным рапарце афіцэр заявіў, што напярэдадні знікненняў Ю.Захаранкі ды В.Ганчара з А.Красоўскім ён выдаваў расстрэльны пісталет, які выкарыстоўваецца для смяротнага пакарання, па патрабаванні тагачаснага міністра ўнутраных справаў Ю.Сівакова.

Высветлілася, што Васіль Лявонаў сам гутарыў па тэлефоне з А.Алкаевым, які і зрабіў такое прызнанне.

Уладзімір Ганчарык заявіў таксама: «Я думаю, трэба чакаць новых матэрыялаў. Яшчэ не толькі Алкаеў скажа. Ёсць людзі, якія маюць пачуццё грамадзянскай адказнасці за ўсё тое, што адбываецца. Ды і гонар афіцэра для іх – не пусты гук».

Кандыдат яшчэ раз падкрэсліў, што не мае рознагалосcяў з Сямёнам Домашам. «Днямі мы пацвердзілі, што мы захоўваем дамоўленасці. Яны заключаюцца ў наступным: у выпадку рэгістрацыі прэтэндэнта №1 усе астатнія здымаюцца і працуюць у адзіным штабе – і цяпер, і на будучыню. Да нас прыйшоў Міхаіл Марыніч, некалькі дзён таму – Аляксандр Ярашук, які разам з Міхаілам Чыгіром працуе па Мінскай вобласці. Зразумела, што канцэнтрацыя сілаў значна змяняе сітуацыю. Я буду рабіць усё, каб дамоўленасці не былі разбураныя», — заявіў У.Ганчарык.

Рыгор БУЯН

«Селектар» без сенсацыяў

Заканчэнне. Пачатак на стар.1

Гэтыя велізарныя сродкі будуць накіраваныя, перш за ўсё, на сацыяльныя патрэбы, на павышэнне, перш за ўсё, пенсіяў, зарплатаў, на мінімізацыю наступстваў чарнобыльскай катастрофы, на ўмацаванне здароўя насельніцтва і, самае галоўнае, — адукацыю і развіццё нашай моладзі», — заявіў учора А.Лукашэнка. Спрытнасць рук – і ніякага махлярства.

Але якім коштам былі дасягнутыя гэтыя поспехі ў аграрнай галіне? Як паведаміў падчас нарады міністр фінансаў Мікалай Корбут, за перыяд студзень-ліпень 2001 года ў сельскую гаспадарку было ўкінута з бюджэту 154 мільярды рублёў, за жнівень-верасень плануецца яшчэ дадаць 43 мільярды.

На селектарнай нарадзе было адзначана, што істотную дапамогу вёсцы аказалі кампаніі, якія займаюцца нафтай на беларускім рынку. Яны ахвяравалі амаль 25 тысяч тонаў саляркі, што складае амаль палову дзяржаўнага рэзерву гэтага віду паліва.

Цікава толькі, якім чынам гэтыя ахвяраванні збіраліся. Аляксандр Лукашэнка нават прысвяціў гэтай праблеме цэлы пасаж. Ён патрабаваў ад прэзідэнта канцэрна «Белнафтахім» Івана Бамбізы пракантраляваць, каб кожная нафтавая кампанія ахвяравала беларускім калгасам і саўгасам «хоць пяць тон саляркі – яны ад гэтага не збядняюць». Пажаданне ўтрымлівала і пагрозы: «Калі я да канца года пабачу, што нейкая кампанія працуе на рынку, якая не падтрымала сялянаў, – крыўдуйце на сябе!»

Такіма чынам, просьба дапамагчы сялу куды больш нагадвае дзяржаўны рэкэт. Тым больш, што кожная юрыдычная асоба, што працуе ў Беларусі, ужо сплачвае падаткі ў бюджэт і абсалютна не абавязаная выконваць дадатковыя ўмовы, якія час ад часу прыдумвае сабе кіраўнік дзяржавы. Патрабаванні дадатковага фінансавання калгасаў, заводаў, прэзідэнцкай адміністрацыі, як і ахвяраванняў у бандыцкі «абшчак», з'яўляюцца абсалютна незаконнымі і ў цывілізаванай краіне сталіся б прадметам асобнага пракурорскага расследавання.

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

Элита и президентские выборы

В рамках проекта «Беларусь: перспективы в XXI веке» в июле 2001 г. НИСЭПИ провел опрос лидеров общественного мнения и экспертов в количестве 65 человек (полисимейкеров, бизнесменов, аналитиков и руководителей СМИ), примерно поровну представляющих государственные и негосударственные структуры. Предлагаем Вам комментарии к наиболее интересным и важным результатам. В большинстве случаев позиции «нет ответа» и «затрудняюсь» исключены.

Результаты опроса показывают, что подавляющее большинство лидеров, независимо от представляемых структур, не хотят, чтобы А. Лукашенко был президентом страны еще один срок. Однако, как можно заметить, наблюдается некоторая тенденция к сокращению сторонников данного мнения и незначительного роста его противников, причем не только в государственном секторе. Связано это, по нашему мнению, с тем, что, во-первых, некоторая часть элиты все более разочаровывается в реальных фигурах, которые противостоят А.Лукашенко. А, во-вторых, нельзя исключать, что в предверии выборов власти разными путями ведут подкуп чиновничества, например, путем увеличения заработков и т.п.

За два месяца резко вырос открытый рейтинг С.Домаша и В.Гончарика. Причем рост рейтинга наблюдается как в государственном, так и негосударственном секторах. И хотя в рейтинге претендентов появилась новая кандидатура М.Маринича, это незначительно повлияло на расстановку сил в оппозиционном лагере. На наш взгляд, это результат формирования коалиции демократических кандидатов, который мы прогнозировали ранее.

Окончание на стр.6

РАСПРЕДЕЛЕНИЕ ОТВЕТОВ НА ВОПРОС: «ХОТЕЛИ БЫ ВЫ, ЧТОБЫ А.ЛУКАШЕНКО БЫЛ ПРЕЗИДЕНТОМ СТРАНЫ ЕЩЕ ОДИН СРОК?», %

Вариант ответа	Все опрошенные			Работники госсектора			Работники негоссектора		
	04.01	05.01	07.01	04.01	05.01	07.01	04.01	05.01	07.01
Нет	91.4	87.5	81.5	77.8	71.0	64.3	100.0	98.0	94.6
Да	4.3	7.5	9.2	11.1	19.4	17.9	–	–	2.7

ДИНАМИКА РАСПРЕДЕЛЕНИЯ ОТВЕТОВ НА ВОПРОС: «ЕСЛИ БЫ ЗАВТРА СОСТОЯЛИСЬ ВЫБОРЫ ПРЕЗИДЕНТА БЕЛАРУСИ, ЗА КОГО БЫ ВЫ ПРОГОЛОСОВАЛИ?», % (ОТКРЫТЫЙ ВОПРОС)

Вариант ответа*	Все опрошенные			Работники госсектора			Работники негоссектора		
	04.01	05.01	07.01	04.01	05.01	07.01	04.01	05.01	07.01
С.Домаш	15.9	18.8	29.5	3.7	6.5	10.7	23.8	26.5	43.3
В.Гончарик	7.2	10.0	16.9	3.7	16.1	25.0	9.5	6.1	10.8
М.Маринич	–	–	12.3	–	–	17.9	–	–	8.1
А.Лукашенко	1.4	7.5	7.7	3.7	19.4	17.9	–	–	–
М.Чигирь	10.1	23.8	6.2	11.1	22.6	–	9.5	24.5	10.8
А.Ярошук	4.3	–	4.6	3.7	–	3.6	4.8–	–	5.4
Л.Калугин	–	–	1.5	–	–	3.6	–	–	–

* Включены лишь те, кто упомянут в последнем опросе

РАСПРЕДЕЛЕНИЕ ОТВЕТОВ НА ВОПРОС: «КАК ВЫ ОТНОСИТЕСЬ К КАЖДОМУ ИЗ ПЕРЕЧИСЛЕННЫХ НИЖЕ ПОЛИТИКОВ?», %

Политик	Все опрошенные		Работники госсектора		Работники негоссектора	
	Положительно	Отрицательно	Полож.	Отриц.	Полож.	Отриц.
В.Гончарик	87.7	10.8	85.7	10.7	89.2	10.8
М.Чигирь	80.0	15.4	64.3	25.0	91.9	8.1
С.Домаш	76.9	9.3	60.7	10.7	89.2	8.1
М.Маринич	72.3	9.2	85.7	–	62.1	16.2
А.Ярошук	58.4	15.3	46.5	10.7	67.6	18.9
П.Козловский	55.3	18.4	35.7	21.5	70.3	16.2
А.Лукашенко	13.9	81.5	28.5	60.7	2.7	97.3
С.Гайдукевич	4.6	83.0	3.6	78.6	5.4	86.5

ВРЕМЯ ВЫБИРАТЬ! 9 СЕНТЯБРЯ

BELARUS

Мы выбираем не президента, а избавление от нищеты, невежества, тупости, воровства и хамства.

Андрей САННИКОВ, дипломат

Русская карательная система

Министр здравоохранения Чеченской республики Ичкерия, доктор Умар Ханбиев, сам прошедший через страшное Чернокозово, а впоследствии, как врач, обследовавший тысячи искалеченных в фильтрационных лагерях людей, делает вывод, что методология пыток, применяемых российскими военными по отношению к этническим чеченцам, разработана в спецлабораториях российских спецслужб.



КОНЦЕНТРАЦИОННЫЕ ЛАГЕРЯ

Для всеобъемлющего представления масштабов жестокости русских в Чечне нужно понять, что это отнюдь не результат действий каких-то неуправляемых группировок. Это государственная модель, которая управляется, контролируется и поощряется верховной Российской властью. Цель очевидна — уничтожение государственности Чечни и геноцид народа. Сами руководители России выражаются более завуалировано: «Окончательное решение Чеченского вопроса».

Одним из факторов, на которых зиждется российская карательная система, являются концентрационные лагеря, именуемые в России «фильтрационными пунктами».

Они были созданы 12 декабря 1994 г. указанием МВД России № 247, якобы для «установления личности и проверки причастности лиц, задержанных в зоне боевых действий». Кроме того, в тех российских тюрьмах (в глубине России), куда этапируются незаконно задержанные чеченцы, для них созданы специальные отделы. В



каждой воинской части МО, МВД, ФСБ и ГРУ, расположенной на территории республики, имеются свои «частные» концентрационные мини-лагеря.

Из обильной информации, которая просачивается из российских карательных структур, стало известно, что Москва спустила секретную директиву Путина: «уничтожать 80% узников-чеченцев, а остальных превращать в инвалидов». По наблюдениям жителей Чечни, русские убивают в первую очередь образованных, физически здоровых и приятной внешности людей. Одна из сельских жительниц однажды заявила прямо в телевизионную камеру: «В живых оставляют косых, кривых и дебильных».

Нелишне вспомнить слова из интервью В.Степашина газете «Коммерсант». На вопрос: «Возможно ли решить чеченскую проблему силовым путем?» он ответил: «Да. Если сначала уничтожить все мужское население, а потом и женское...». На вопрос: «Насколько это реально?» он ответил: «Генералы говорят, что это возможно».

Целенаправленно уничтожается всё то, что связано с чеченской государственностью. Преследуются, похищаются или физически уничтожаются представители властных структур ЧРИ. Целенаправленно разрушаются мечети. Под видом борьбы с «ваххабитами», идёт преследование и уничтожение чеченцев по религиозному признаку. Уничтожаются религиозные деятели, отказавшиеся сотрудничать с российскими спецслужбами. Физически уничтожается чеченская творческая и научная интеллигенция, — писатели, художники, артисты, учёные. Полностью разрушена вся экономическая инфраструктура Ичкерии. Геноцид налицо, его не видит только тот, кто не хочет видеть, причём геноцид во всех его формах.

По данным правительства ЧРИ, в фильтрационных концлагерях РФ с начала этой войны уничтожено более 40 тыс. мирных чеченскимх граждан. Подчёркиваю: это только те, кто был уничтожен непосредственно в концлагерях, а мирные жители, погибшие под бомбами и артобстрелами, а также застреленные во время «зачисток», в это число не входят. Более 20 тыс. человек, задержанных при различных обстоятельствах, бесследно исчезло. Примерно такое же количество узников (20 тыс.) томятся сегодня в концлагерях, подвергаемые пыткам и бессудным убийствам.

Как бывший узник концлагеря, я сам на себе испытал русские пытки. К тому же, как врач, я постоянно сталкиваюсь с проблемами здоровья бывших узников концлагерей. Судя по изощрённости и технической продуманности пыток, которым их там подвергали, становится ясно, что пытки эти — не плод больного воображения одиночек-садистов. Пытки разработаны в спецлабораториях российских спецслужб. А тот факт, что в разных концлагерях в деталях повторяются одни и те же пыточные методы, наводит на мысль о том, что в каждом лагере должны быть типовые инструкции или в крайнем случае работать прикомандированные из Москвы «заплечных дел» специалисты. Превращение людей в калек поставлено у русских на научную основу.

На основе анализа проведённых мной исследований я составил перечень типичных пыток, применяемых в фильтрационных лагерях. Я классифицировал их как психические пытки — массовые и индивидуальные и физические пытки — также массовые и индивидуальные.

ПСИХИЧЕСКИЕ ПЫТКИ

Пытка «Мнимый расстрел»

Это испытание проходит почти каждый узник, и мне хорошо известно, что испытывают при такой пытке. Я пережил колоссальный стресс, не соизмеримый с тем, что переживает человек, оказавшийся под бомбами или на минном поле. Появляется ощущение полной беззащитности и безысходности. В какой-то момент вдруг прерывается осознание происходящего, и, хотя ты отчетливо видишь все, что происходит, адекватная реакция утрачена. Человек теряет чувство страха...

Тогда я решил: как только прозвучит выстрел, крикну громко: «Аллаху Акбар!». В этом проявилась не то что храбрость моя или набожность... Это было подсознательное сопротивление агрессии, осознание, что это мое единственное оружие в тот момент.

От такого стресса человек избавляется долго и трудно. И о смерти рассуждаешь уже не как о чём-то страшном. Смерть представляется, как спасательный круг в океане ужасов нечеловеческой жестокости русской карательной политики.

Пытка «Звуковые раздражители»

В концлагерях, особенно ночью, можно слышать дикие душераздирающие крики истязаемых жертв. На узников это действует очень удручающе. Истощённые, ослабленные пытками люди рисуют в своём воображении страшные картины самых разнообразных пыток, о которых они пока ещё ничего не знают, но которые, как им начинает казаться, им обязательно предстоит испытать. Страх заползает в души, обостряется восприятие ситуации, в которой они оказались, они перестают спать.

Пытки, унижающие достоинство человека

В Чернокозово арестованного заставляли ползти с одного конца коридора в другой, чтобы, лежа на животе на полу, громко отрапортовать поджидающему его там российскому солдату: «Товарищ сержант! Такой-то, такой-то «приполз по вашему приказанию!». И многие чеченские парни погибали на месте, отказываясь участвовать в этом спектакле. Существует много свидетельств сексуального насилия над узниками-мужчинами. Редко кто выживает после этого. Такие издевательства часто заканчиваются самоубийством, что очень не характерно для чеченской ментальности. Те же, кто выживает, говорят, что силу им придавали мысли о мести. И действительно, теперь их единственная цель на всю оставшуюся жизнь — мстить, мстить, мстить!

Пытка «Принудительное присутствие на пытках»

Бывшие узники концлагерей всегда сильно волнуются, когда рассказывают о пытках других, проходящих на их глазах. Мне это понятно. В феврале 2000 г. русские повезли нас в Девкар-Эвла (Толстов-Юрт) и по дороге начали выбрасывать из автобусов раненых. Большинство были с ампутированными конечностями (подорвавшиеся на минах), многим мы ещё не успели оказать хирургическую помощь. Их били сапогами прямо по культям рук и ног! Душераздирающие крики! Когда стали избивать меня, я уже ничего не чувствовал. В ушах стояли отчаянные крики этих несчастных, перед глазами мелькали их искажённые лица...

Словесные пытки

Словесные пытки оказывает на человека сильное психологическое воздействие, не меньшее, чем другие психологические пытки. Угрозы убийства; скрупулёзное описание в деталях той пытки, в результате которой, как объясняют узнику, он будет умерщвлён; оскорбления, унижающие как достоинство нации, так и достоинство конкретного человека; нецензурная брань — всё это сильно действует на психику узника.

Почти все бывшие заключённые фильтрационных лагерей отмечали низкую культуру и нравственную деградацию своих палачей. Это, пожалуй, единственные положительные эмоции, которые узники уносят с собой из этого ада.

Массовая психическая пытка «Зачистка»

Сегодня вся Чечня, как выразилась Елена Бонэр, — это большой концентрационный лагерь. Каждый житель Чечни, от новорожденного до глубокого старика — узники этого концлагеря, систематически подвергаемые в массовом порядке психической пытке, так называемой «зачистке». Под предлогом проверки документов русские заходят в селение и начинается открытое мародёрство и избиение мирных жителей, включая стариков и детей. Оканчивается это всегда задержанием, по меньшей мере, нескольких ни в чём не повинных молодых людей, обречённых, если их не убьют сразу, на ад фильтрационных лагерей.

Хронические стрессы ежедневно уносят жизни десятков, а иногда и сотен мирных граждан, погибающих от инфаркта сердца и инсульта головного мозга. Отсутствие всякой медицинской помощи множит количество этих жертв. За последние два года в Чечню не завозили никаких психотропных препаратов. И это сейчас в условиях постоянных массовых посттравматических расстройств!

ФИЗИЧЕСКИЕ ПЫТКИ

Пытка электротоком

Подавляющее большинство узников концлагерей проходит через эту пытку. Чтобы усилить боль, электроды прикрепляются к самым чувствительным местам — половые органы, уши, нос, затылок, подмышечная область. Есть свидетельства избирательного воздействия током на отдельный человеческий орган с целью его разрушения, например, на предстательную железу. Я как врач вначале отказывался верить этому. Однако, осмотрев немало пациентов, бывших узников концлагерей, убедился, что это не сказки. По свидетельствам этих жертв, один из специально изготовленных электродов вводится в прямую кишку, а другой прикрепляется к половым органам. Когда дают ток, сразу возникает невыносимая боль внизу живота. После этой пытки у человека начинается расстройство мочеиспускания, хронические боли в промежности и пояснице, а при медицинском обследовании выявляется полное разрушение предстательной железы. Разработать такой метод, на мой взгляд, мог только высококвалифицированный специалист, что говорит о лабораторном происхождении этой пытки.

Пытка «Ласточка»

